**Алеся Белановіч-Пэтц**

# Цяжарныя савецкія жанчыны на прымусовых работах у райху: нацысцкая палітыка і практыка

Амаль пяць дзесяцігоддзяў пасля Другой сусветнай вайны захоўвалася маўчанне пра мільёны савецкіх грамадзян, якія былі вывезены на прымусовыя работы ў германскі райх. Савецкая гістарыяграфія, у тым ліку і беларуская гістарычная навука таго перыяда, пакідала гэты аспект "Вялікай Айчыннай вайны" за межамі сваіх даследаванняў.

Ранейшы статус табу гэта тэма губляе толькі ў постсавецкай Беларусі. Значным прарывам у айчыннай навуцы было выданне зборнікаў дакументаў "Беларускія остарбайтары" у другой палове 90-х гг. Навуковую канцэпцыю тэмы замацавала гісторыка-аналітычнае даследаванне "Беларускія остарбайтэры", выдадзенае аўтарскім калектывам у складзе Г.Кнацько, У.Адамушка, Н. Бандарэнка, У.Селеменева у 2001 г[1]. На падставе сабраных дакументаў аўтары прасачылі эвалюцыю метадаў выгану і выкарыстання працы савецкіх рабочых, ролю калабарацыянісцкіх арганізацый у вярбоўцы насельніцтва, умовы жыцця і працы ў Германскім райху і этапы рэпатрыяцыі "остарбайтараў". У выданні, падрыхтаваным сумесна айчыннымі і замежнымі гісторыкамі, "Ostarbeiter"- "Остарбайтары". Прымусовыя работы беларускага насельніцтва ў Аўстрыі" змяшчаецца шэраг архіўных дакументаў, аналізуецца іерархія замежных рабочых у нацысцкай сістэме, паказаны этапы вярбоўкі насельніцтва на працу ў Германію і ход пасляваеннай рэпатрыяцыі[2].

Асобныя аспекты нямецкай палітыкі ў дачыненні да выкарыстання працы беларускага насельніцтва знайшлі частковае адлюстраванне ў працах беларускіх гісторыкаў І.Нікалаевай, Я.Гребеня, С.Новікава[3]. Надзвычайную каштоўнасць

[1] Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941-1944): Документы и материалы. В 2 кн. Кн.1 и Кн.2 (1941-1942). – Минск, 1997; Белорусские остарбайтеры: ист.- аналит. исслед. // Под ред. Г. Кнатько .- Минск, 2001.

[2] "Ostarbeiter"- "Остарбайтеры". Принудительный труд белорусского населения в Австрии. Документы и материалы. Грац - Минск, 2003.

[3] Нікалаева І.У. Нямецка-фашысцкая палітыка ў адносінах да мясцовых жанчын на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (1941-1944 гг.) // Другая сусветная вайна: новыя аспекы даследаванняў. Матэрыялы міжнароднага навуковага семінара 1 верасня 2003 года, Мінск. Адк. рэд. В.Ф. Балакіраў, К.І.Козак.-Мінск, 2004. – С. 88-95.; Гребень Е.А. Привлечение нацистской Германией граждан Беларуси на принудительные работы в годы Великой Отечественной войны (1941-1944 гг.) // Беларусь у перыяд Вялікай Айчыннай вайны: погляд у святле новых крыніц. -

маюць успаміны былых прымусовых рабочых, якія прагучалі ў хроніцы "Памяць" і былі надрукаваны Гістарычнай майстэрняй Мінска і гістарычнымі часопісамі[4].

Тым не менш, летапіс гісторыі беларускіх “остарбайтараў” яшчэ рана лічыць завершаным. Напрыклад, мы да гэтага часу ведаем вельмі мала пра лёс жанчын і дзяцей, народжаных у райху. Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца дaследаванне палітыкі вышэйшага нацысцкага кіраўніцтва ў дачыненні да цяжарных “остарбайтарак” і іх дзяцей, народжаных у Германскім райху на аснове архіўнага матэрыялу, выяўленага аўтарам ў нацыянальным архіве РБ, бундэсархіве Германіі, гарадскіх архівах гарадоў Гамбург і Глюкштадт, а таксама інтэрв’ю з былымі “остарбайтаркамі”.

*Стаўленне да цяжарных “остарбайтарак”*

Нацысцкае кіраўніцтва абмяжоўвала прыцягненне нямецкіх жанчын да работ ў прамысловасці з ідэалагічных меркаванняў. Асноўная роля нямецкай жанчыны бачылася, у першую чаргу, у нараджэнні здаровых дзяцей і выкананні хатніх абавязкаў. Райхсмаршал Герынг падкрэсліваў, што "у будучым нямецкая жанчына не павінна так шмат выкарыстоўвацца ў працоўным працэсе"[5]. А ў загадзе галоўнакамандуючага групы армій "Цэнтр" аб забеспячэнні харчаваннем мабілізаванай у райх працоўнай сілы адзначалася ваенная важнасць выкарыстання “кожнай адзінкі рабочай сілы па свайму назначэнню”, і што “з-за кожнай дзяўчыны, якая засталася ў раёне аперацыі, мы вымушаны прыцягваць жонак франтавікоў на работу ў ваеннай прамысловасці”[6].

Такім чынам, вырашэнне праблемы недахопу працоўных рук у райху з пачаткам нямецка-савецкай вайны хутка было знойдзена – савецкія жанчыны. Так, намаганнямі ўпаўнаважанага па выкарыстанню працоўнай сілы Фрыца Заўкеля, 8 верасня 1942 г. была выдадзена дырэктыва аб неабходнай мабілізацыі ў Германію 400 000 жанчын і дзяўчат ад 15 да 35 гадоў: 250 000 належала вывезці з

---

Мінск, 2005.-С.61-104.; Новікаў С.Я. Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941-1944 гг. (агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў) / С.Я.Новікаў, Мінск, 2002.

[4] Тяжёлые слова: Судьбы восточных рабочих. СПб., 2000; Літвін М. Латка з надпісам "Ост". Успаміны "остарбайтаркі" // Крыніца. Славянскі свет. - Мінск, 2003. - № 9, - С. 18-24; Гурин Н.А. Пуховщина помнит: Воспоминания о войне / Н.А.Гурин. – Мінск, 2005; Жанчыны ў Другой сусветнай вайне: гісторыя барацьбы і выжывання. Матэрыялы міжнароднай навукова - практычнай канферэнцыі 4 сакавіка 2005 года, Мінск, 2006.

[5] Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941-1944): Документы и материалы. В 2 кн. Кн.1(1941-1942). Мінск, 1997. – С. 37.

[6] НАРБ, ф.3500, воп.2, спр.38, ст.331.

райхскамісарыятаў Остланд і Украіна, а 150 000 – з аператыўных армейскіх зон[7]. Праз два дні выходзяць і дырэктывы райхсфюрера СС і шэфа паліцыі Гімлера аб выкарыстанні жаночага рабочага персанала у хатняй гаспадарцы Германіі. Адзначалася, што выкарыстанне “остарбайтарак” у германскай гаспадарцы дазвалялася толькі “пасля задавальнення патрэбы ў рабочай сіле на прадпрыемствах узбраення і ў сельскай гаспадарцы”[8].

Той факт, што ні працоўны, ні мацярынскі кодэкс аховы правоў для “остарбайтарак” не дзейнічаў, рабіў іх асабліва “прывабнымі” для выкарыстання на патрэбы ваеннай эканомікі. Да таго ж у мэтах аховы “нямецкай крыві” праводзілася палітыка, зыходзячы з якой не меньш за палову вывезенай з Савецкага саюза працоўнай сілы павінны былі складаць жанчыны.

У такой сітуацыі перад нацысцкім кіраўніцтвам даволі хутка паўстала пытанне абыходжання з цяжарнымі “остарбайтаркамі” і з іх народжанымі ў райху немаўлятамі. Першапачаткова цяжарных і незамужніх “усходніх работніц” вызвалялі ад прымусовых работ у Германскім райху і адпраўлялі на радзіму[9]. На прыканцы 1942 г. сітуацыя змянілася. Пасля ўзгаднення з райхсфюрэрам СС Гімлерам Заўкель прыняў часовую пастанову “Аб абыходжанні з цяжарнымі замежнымі работніцамі”[10]. Згодна з дадзенай пастановай ад вяртання на радзіму цяжарных, але працаздольных “остарбайтарак” было вырашана адмовіцца, цяжарныя жанчыны іншых нацыянальнасцей ў выключных выпадках, са згоды кіраўніка прадпрыемства маглі вяртацца на радзіму. Вырашальным у прыняцці гэтай пастановы з’явіліся патрэбы ваеннай эканомікі і павялічыўшыся недахоп працоўных рук на нямецкіх прадпрыемствах. У такой сітуацыі нацысцкае кіраўніцтва палічыла мэтазгодным карыстацца працоўным патэнцыялам нават цяжарных жанчын. У сакавіку 1943 г. дзейнасць пастановы было працягнута “на перыяд ваенных дзеянняў”[11].

---

7 Winkler, U. “Hauswirtschaftliche Ostarbeiterinnen” – Zwangsarbeit in deutschen Haushalten // Stiften gehen: NS – Zwangsarbeit und Entschädigungsdebatte. Köln, 2000. - S.154

8 Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941-1944): Документы и материалы. В 2 кн. Кн.2 (1943-1944). Мінск, 1996. - С.165.

9 Schäfer, A. Zwangsarbeiter –und NS – Rassenpolitik: russische und polnische Arbeitskräfte in Württemberg 1939-1945. Kohlhammer, 2000.- S.160.

10 Bundesaechiv Berlin ( далей BA), NS 19/940 Persönlicher Stab Reichsführer SS. Behandlung schwangerer ausländischer Arbeitskräfte. Berlin, 20.März 1943.

11 Reichsverband der Landkrankenkassen, Berlin-Friedenau, am 20.Februar 1943, betrifft: Rückführung schwangerer ausländischer Arbeitskräfte. Rüstungsproduktion und Zwangsarbeit in Volkswagenwerk 1939-1945: e. Dokumentation/ Klaus-Jörg Siegfried. 1987. - S.171.

Неабходна адзначыць, што нямецкае заканадаўства па ахове працы жанчын з дзецьмі і цяжарных жанчын распаўсюджвалася і на замежных работніц - матуль з Балгарыі, Італіі, Харватыі, Славакіі, Іспаніі ды Венгрыі. Для польскіх прымусовых работніц нацысцкім кіраўніцтвам была прадугледжана так называемая “мінімальная ахова” (Mindestschutz). У дачыненні да работніц з усходніх тэрыторый, якія не надзяляліся нават прымітыўнымі працоўнымі правамі, прадугледжваліся “прадпісанні”. Да канчатковага іх напісання і ўзгаднення для “остарбайтарак” прадугледжваліся такія ж прадпісанні як для польскіх прымусовых работніц. Асноўнай мэта гэтых прадпісанняў было прыцягненне цяжарных работніц да працы на працягу як мага большага тэрміна падчас цяжарнасці і настолькі хуткага як гэта магчыма вяртання жанчын на прадпрыемствы і ў сельскую гаспадарку. Жанчыны толькі ўмоўна вызваляліся ад працы на тэрмін да 2 тydняў перад нараджэннем дзіця і на 6 тydняў пасля родаў. Прадпісанні па абыходжанню з цяжарнымі замежнымі работніцамі райхсфюрэра СС Гімлера ад 20 сакавіка 1943 г. прадугледжвалі забеспячэнне працай нават пры размяшчэнні жанчын у радзільнях да родаў і пасля[12].

У нараджэнні дзяцей “расава-небяспечных” савецкіх работніц нацысцкаму кіраўніцтву бачылася вялікая пагроза “чысціні арыйскай расы”. Нацысцкія дырэктывы ставілі пад увагу ідэалагічную важнасць пабудовы асобных радзільных дамоў для “остарбайтарак” і прадухілення размяшчэння парадзіх ці дзяцей “остарбайтарак” ва ўстановах прадугледжаных для немцаў.

Радзільні “з самым прымітыўным абсталяваннем” павінны былі ўсталёўвацца ў бараках для хворых “остарбайтэраў” ці будавацца на тэрыторыі прадпрыемстваў. У сітуацыі, калі маленькія прыватныя прадпрыемствы не мелі такой мачымасці, то цяжарных жанчын напраўлялі ў радзільні іншых устаноў. Так, па ініцыятыве працоўнага нямецкага фронту ў Гамбургу на тэрыторыі арганізацыі быў усталяваны барак для дзяцей “остарбайтарак”, падчас догляду за дзецьмі матулі былі працаўладкаваны на кухне арганізацыі[13]. У сельскіх гаспадарках гэта пытанне вырашалася пры дапамозе сельскага самакіравання.

Часам “остарбайтаркам” увогуле лічылася не абавязковым аказваць медыцынскую дапамогу. Райхсміністэрства працы ў прадпісаннях пра стварэнне радзільняў цынічна адзначала, што “прымітыўныя усходнія народы прызвычаіліся разраджацца самі па сабе, таму спецыяльная дапамога ім не патрабуецца.

[12] BA, NS 19/940 Persönlicher Stab Reichsführer SS. Behandlung schwangerer ausländischer Arbeitskräfte. Berlin, 20.März 1943.

[13] StaHH, 377-10 Behörde für Ernährung und Landwirtschaft I A b VIII 4 a. Die Deutsche Arbeitsfront, am 21.Februar 1944. Betrifft: Versorgung von Kindern der Polen und Zwangsarbeiter.

Дастаткова калі, прыцягваюцца старыя остарбайтаркі, якія самі дзяцей нараджалі”. Падчас непрацаздольнасці, не больш за 4 месяцы, прадпрыемствы, якія мелі радзільні на сваёй тэрыторыі, пераймалі кошт на ўтрыманне і харчаванне ў памеры 1,5 райхсмарак у дзень. З таго моманту як цяжарная ці парадзіха была занятая гаспадарчымі работамі, гэтай даплаты яна не атрымлівала, а з яе зарплаты вылічваўся кошт на харчаванне дзіця.

У дачыненні да забеспячэння цяжарных замежных работніц і іх дзяцей неабходным адзеннем райхсміністэрствам эканомікі былі прыняты наступныя рашэнні: “для польскіх і ўсходніх работніц, пры самой вострай на тое неабходнасці, прадставіць роўна столькі тканіны, колькі гэта патрабуецца для змены наяўнага адзення. Пры запытах на абутак ў агульным, і асабліва ў дачыненні да ўсходніх народаў - не выдаваць. Зручны абутак гэта цывілізацыйнае вынаходніцтва, якое ўсходніх народаў не датычыцца. Толькі ў выпадку, калі дрэнны абутак не дазваляе працаваць, выдаць новы“[14]. Відавочна, што цяжарнасць ні ў якім разе не з’яўлялася для жанчыны магчымай палёгкай. Нацысцкія прадпісанні прадугледжвалі жорсткую дыскрымінацыю цяжарных “остарбайтарак”: непасільную працу, недастатковы рацыён харчавання і цынічнае зневажэнне чалавечай годнасці.

*Дзеці “остарбайтарак”, народжаныя ў райху*

З боку нацысцкага кіраўніцтва адзначалася надзвычайная важнасць своечасовага выяўлення цяжарнасці “остарбайтаркі” і правядзення расавай праверкі. Дзеці савецкіх работніц, народжаныя ад савецкіх работнікаў, адпраўляліся ў спецыяльныя ўстановы па догляду за дзецьмі “остарбайтараў”. Дзеці, народжаныя ад немцаў ці блізкіх да арыйскага народаў, такіх як датчане, нідэрландцы, нарвежцы, шведы, разглядаліся як годных для анямечвання. Для прызнання дзіця вартым анямечвання прадугледжвалася складаная расавая праверка бацькоў. Гэта працэдура ўваходзіла ў кампетэнцыю кіраўніка паліцыі і службаў СС. Калі вынік быў станоўчы, немаўля забіралі ад матулі. Дзіця, годнае для анямечвання ўтрымлівалася і выхоўвалася ва ўстановах для дзяцей “чыстай расы”. У сваёй дырэктыве ад 24 кастрычніка 1944 г. Заўкель адзначае важнасць “дзяцей замежніц, носьбітаў часткова нямецкай крыві і блізкай да нямецкай крыві разглядаць як каштоўных, не адсылаць ва ўстановы па догляду за дзецьмі

[14] BA, R 3901/20469 Reichsarbeitsministerium. Betrifft: Behandlung schwangerer ausländischer Arbeitskräfte. Berlin, am 20.März 1943. 7. Kleider, Wäsche usw. a. Versorgung schwangerer Ausländerinnen.

замежніц, а захоўваць для Германіі і выхаваць як нямецкіх дзяцей”[15]. Там дзеці “чыстай расы” знаходзіліся да атрымання дазволу на ўдачарэнне ці ўсынаўленне нямецкімі сем’ямі. Пра паходжанне дзяцей, іх сапраўдных бацькоў нямецкім сем’ям не паведамлялі. Да гэтага часу не існуе статыстыкі, колькі дзяцей патрапілі пад так званае “анямечванне”, бо гэта інфармацыя знаходзіцца пад аховай права на тайну асабістага жыцця. Многія так ніколі і не даведаюцца, хто з’яўляецца іх сапраўднымі бацькамі.

Палітыка з боку нацысцкага кіраўніцтва ў дачыненні да немаўлят і дзяцей “остарбайтарак”, якія разглядаліся, як дзеці “нізкай расы” была даволі спрэчнай. З аднаго боку, ад жанчын з Усходу патрабавалі ў першую чаргу выключна выканання фізічнай працы, у той час як цяжарнасць для гэтага была толькі перашкодай. Да таго ж у дзецях “нізкай расы” нацысты першапачаткова не бачылі патрэбы, зыходзячы з расавай палітыкі яны не мелі права на жыццё. З іншага ж боку, іх можна было выгадаваць на патрэбы нямецкай эканомікі.

Невызначанасць у вырашэнні гэтага пытання нацысцкім кіраўніцтвам выразна бачна на прыкладзе сітуацыі з радзільняй у нямецкім горадзе Пірне. Падчас наведвання ўстановы гаўляйтэр Верхняга Дуная Айгрубер заўважыў, што атрымліваючы толькі 0,5 л. малака і 1,5 кавалка цукра немаўляты не атрымліваюць жыццёва неабходнае харчаванне і паміраюць. “Мне патлумачылі такі стан супярэчнасцямі па гэтаму пытанню.Так як агульнае стаўленне не знойдзена, з мэтай “абараніць твар у вачах остарбайтарак” немаўляты атрымліваюць недастатковы, але рацыён, пры якім немаўляты праз некалькі месяцаў паміраюць. Калі нам не патрэбны гэтыя дзеці, то ёсць іншыя метады пазбаўлення ад іх, без згубы літраў малака…але, калі мы хочам выкарыстаць іх будучы патэнцыял на прадпрыемствах, то трэба павялічыць харчаванне.” З просьбай ўнесці карэктывы ў вырашэнне гэтага пытання, з прычыны планавай забудовы другой па ліку радзільні гаўляйтэр звярнуўся да Гімлера[16], які ў афіцыйным лісце даў згоду на павышэнне нормаў харчавання.

Прадпісанні харчавання для дзяцей “остарбайтарак” у прыватнай і сельскай гаспадарках прадугледжвалі рацыён нямецкіх дзяцей. Але як сведчыць пастанова па харчаванню дзяцей польскіх і “ўсходніх работніц” службы па забеспячэнню ў нямецкім горадзе Кіль “дзеці остарбайтараў і дзеці палякаў прынцыпова выключаюцца з атрымання дзіцячага крухмалу, дзіцячага збожжавага хлеба ці

[15] BA, R 3901/20467. betrifft: Behandlung schwangerer aus. Arbeiterinnen sowie nichteinsatzfähigen Ausländer und der Ausländerkinder. Schnellbrief, am 24.Oktober 1944.

[16] BA, NS 19/3596 Abschrift, NSDAP, Reichsleitung, betrifft: Versorgung der Kinder von ausländischen Arbeitskräften Berlin, am 11. August 1943.

рысавага харчовага прадукта, штучнага мёда, парашок какавы і натуральны з усіх дадатковых прадуктаў харчавання”[17].

Згодна з пастановай райхснамесніка ў Гамбурзе па зямельнай і асноўнай службе харчавання для дзяцей “остарбайтарак” установы па дагляду за дзецьмі “остарбайтарак” атрымлівалі наступныя прадукты ў тыдзень на адно дзіця:

| Прадукты | 0 – 1 год | 1 – 10 гадоў |
|---|---|---|
| Хлеб | 800 г. з пшанічнай мукі | 1250 г., 250 г. белага |
| Мяса | - | 100 г. |
| Масла | 100 г. | 100 г. |
| Харчовы прадукт | 250 г. | 150 г. |
| Цукар | 300 г. | 225 г. |
| Сурагат гарбаты | 7 г. | 14 г. |
| Цэльнае малако | 3,5 л. | 3,5 л. |
| Бульба | 2500 г. | 3500 г. |

Да гадавалага ўзроста дзіця прадукты харчавання, згодна прадпісанню, атрымлівалі як дадатковы рацыён матулі “остарбайтаркі”. Дзеці “остарбайтараў” з 10-ці гадовага ўзроста атрымлівалі, незалежна ад таго знаходзяцця яны ў лагеры ці дзіцячай установе, рацыён “остарбайтара”[18]. Для параўнання сучасны рацыён, які прапанаваны для дзяцей 1,5-2-х гадоў у грамах складаецца з наступных кампанентаў: хлеб пшанічны –420; жытні хлеб – 140; мука – 105; мяса – 420; крупы, макароны – 210; пячэнне – 70; бульба – 1050; гароднiна розная – 1050; фрукты свежыя, журавіны – 105; мяса, печань – 420; рыба, філе – 105; яйцо – 10,5 шт.; масла сметанковае – 105; алей – 35; тварог – 280; смятана – 70; сыр – 21; гарбата – 1,4; какао – 1,4; соль – 35[19]. Відавочна, што прапанаваны рацыён для дзяцей “остарбайтарак” быў больш чым недастатковым і асуджаў немаўлят і дзяцей на галодную смерць.

---

[17] StaHH, 377-10 Behörde für Ernährung und Landwirtschaft I A b VIII 4 d. Niederschrift Nr.24 über das Ergebnis der Dienstbesprechung der Ernährungsämten am 17.December 1943 in Kiel. Verpflegung von Kindern von Polen und Ostarbeitern.

[18] StaHH, 377-10 Behörde für Ernährung und Landwirtschaft I A b VIII 4 d. Der Reichsstatthalter in Hamburg Landes und Hauptenährungsamt- Verpflegung der Kinder von Polen und Ostarbeitern, 26-2-1944.

[19] http://un.by/news/world/2005/08-08-05-03.html аан ў беларусі; Калюжин Г., Дерюгина М. От колыбели до школы. – Минск, 1989. – С. 169.

Месцаў для ўтрымання немаўлят не хапала, нярэдка радзільні былі размешчаныя ў хутка і няякасна пабудаваных бараках. Хваробы і нядбайны медыцынскі дагляд за немаўлятамі "остарбайтарак" быў звычайная з'явай. Так, у дзіцячым доме для немаўлят "остарбайтарак" і польскіх работніц, што былі заняты на прадпрыемстве "Фольксваген" у Люнебургу ахвярамі эпідэміі каросты і фурункула, страўнікавых захворванняў былі больш чым 300 немаўлят[20]. У бальшыні смяротных выпадкаў не быў пастаўлены дыягназ, на пасведчаннях смерці стаяла спасылка на "слабасць ад нараджэння". Са справаздачы доктара прадпрыемства Кёрбеля вынікае, што "дзеці, народжаныя замужнімі рускімі і польскімі, а ў большасці незамужнімі работніцамі…штучнае харчаванне амаль ніколі не прымаюць, вельмі хутка губляюць вагу і імунітэт супраціўлення" [21].

Спісаўшы праблему штучнага харчавання на "прынароджаную ідэю натуральнага харчавання ў народаў Расіі" немаўляты ўвогулле перасталі атрымліваць дадатковы рацыён. Але пры гэтым магчымасць выкарміць дзіця натуральным малаком для "остарбайтаркі" была абмежаванай. Часта немагчыма было правесці з дзіцям у радзільне нават прадпісаныя 6 тыдняў пасля яго нараджэння. У тым жа Люнебургу кіраўніцва радзільні скардзілася ў гадавой справаздачы на "ненадзейных матуль, якія крадуць дзіцячую бялізну, посуд і розную дробязь", што і стала падставай для скарачэння тэрміна дагляда за дзіцям "ненадзейнай матуляй" да 14-16 дзён[22].

На пасляваенным судзебным паседжанні ў дачыненні да доктара Кёрбеля і работнікаў радзільні было высветлена, што асноўнай прычынай высокай смяротнасці немаўлят з'явілася ранняе разлуччэнне іх з матулямі, недахоп штучнага харчавання, перазапоўненасць радзільні, непрафесійны медыцынскі дагляд за немаўлятамі і непрыманне адпаведных дзеянняў па ізаляцыі і ўратаванню хворых, інфіцыраваных дзяцей[23].

---

[20] Rüstungsproduktion und Zwangsarbeit im Volkswagenwerk 1939-1945: e. Dokumentation/ Klaus-Jörg Siegfried.1987. Das Massensterben neugeborener Kinder von Zwangsarbeiterinnen aus Polen und der Sowjetunion. - S. 168.

[21] Aus einem Bericht des Werkarztes über das „Ausländerkinderpflegeheim der Wirtschaftsbetriebe der Volkswagenwerk G.m.b.H." Rüstungsproduktion und Zwangsarbeit im Volkswagenwerk 1939-1945: e. Dokumentation/ Klaus-Jörg Siegfried.1987. Das Massensterben neugeborener Kinder von Zwangsarbeiterinnen aus Polen und der Sowjetunion, - S.190.

[22] Aus dem Jahresbericht 1944 über das "Ausländerkinderpflegeheim" Rüstungsproduktion und Zwangsarbeit im Volkswagenwerk 1939-1945: e. Dokumentation/ Klaus-Jörg Siegfried.1987. Das Massensterben neugeborener Kinder von Zwangsarbeiterinnen aus Polen und der Sowjetunion. - S.191.

[23] Aus dem Kriegsverbrecherprozeß v.20.05.1946 – 24.06.1946 in Helmstedt gegen den Werksarzt Dr. Körbel u.a. Rüstungsproduktion und Zwangsarbeit im Volkswagenwerk 1939-1945: e.

Магчымае спыненне цяжарнасці, аборт, на думку нацысцкіх кіраўнікоў, быў самым аптымальным варыянтам у прадухіленні адрыву жанчын ад выканання працы. Часам кіраўнікі радзільняў выступалі не за паляпшэнне ўмоў для народжаных дзяцей, а за павелічэнне абортаў. З мая 1944 года толькі ў клініцы завода "Фольксваген" было праведзена 167 абортаў[24].

З мэтай захаваць жыццё дзіцяці і, не жадаючы быць разлучанай з навароджаным, савецкія жанчыны ў некаторых выпадках не паведамлялі пра цяжарнасць, спрабавалі захаваць гэта ў тайне. Напрыклад, Ніна Салаўёва, выгнаная з Віцебска, працавала на фабрыцы "Бергман" у Гамбурзе. Яе дачка Аляксандра (зараз Паўлінская), была народжана таемна і без медыцынскай дапамогі. У інтэрв'ю аўтару артыкула Аляксандра падзялілася: "Пра бацьку нічога не ведаю, матуля ніколі пра гэта не казала. Можа згвалціў немец, можа пакахаў рускі… я нарадзілася 23 ліпеня 1944 г., а на Новы год атрымала пасведчанне. Матуля мяне хавала ў лагеры, дзяўчаты дапамагалі, заставаліся са мной па чарзе, калі працавалі на кухне. Калі нас вызвалілі адзін немец хацеў, каб мы засталіся, але мы вярнуліся на радзіму. Матуля паказвала мой фотаздымак у добрым адзенні і казала, што гэта падарунак майго бацькі. Матулю пасля чатыры разы вызывалі на допыт. Я ведала, што я не так, як ўсе народжана. У пасведчанні стаяла – Гамбург. Гамбург узгадвалі паўсюль. У камсамол не ўзялі. А пры паступленні ва ўніверсітэт у мяне атрымалася пасведчанне пра месца нараджэння затаіць".

*Падсумаванне*

Такім чынам, гісторыя беларускіх "остарбайтарак", якія складалі больш за 60 % беларускіх прымусовых рабочых у райхку, дае магчымасць выявіць новыя аспекты злачыннага працавыкарыстання савецкіх рабочых у Германскім райху падчас Другой сусветнай вайны.

У прымітыўных умовах працы і пражывання яны былі вымушаны працаваць на патрэбы ваеннай эканомікі Германскага райха: на вялікіх фабрыках, малых прадпрыемствах, у сельскай і хатняй гаспадарках. Харчаванне, утрыманне, вольны час, стаўленне да "остарбайтарак" і нават цяжарнасць і мацярынства – усё было рэгламентавана згодна з расава-ідэалагічнымі ўяўленнямі нацысцкага

---

Dokumentation/ Klaus-Jörg Siegfried.1987. Das Massensterben neugeborener Kinder von Zwangsarbeiterinnen aus Polen und der Sowjetunion. - S.187.

[24] Aus einem Bericht des Werkarztes über das „Ausländerkinderpflegeheim der Wirtschaftsbetriebe der Volkswagenwerk G.m.b.H." Rüstungsproduktion und Zwangsarbeit im Volkswagenwerk 1939-1945: e. Dokumentation/ Klaus-Jörg Siegfried.1987. Das Massensterben neugeborener Kinder von Zwangsarbeiterinnen aus Polen und der Sowjetunion. - S.190.

кіраўніцтва да рабочых з акупаванай тэрыторыі Савецкага саюза. Асноўным і вырашальным для нацысцкага кіраўніцтва было выкарыстанне працы жанчын на патрэбы ваеннай эканомікі і ў такой сітуацыі цяжарнасць разглядалася ў першую чаргу як перашкода і згуба працоўных рук.

*Падрыхтавана для архіва Вуснай гісторыі Беларусі ў студзені 2015 г.*